І. І. Крук

# «Першым разочкам, Божым часочкам» — сімволіка *першага* ў міфапаэтычнай спадчыне і абрадавай практыцы беларусаў

*У артыкуле разглядаюцца шматлікія вусна-паэтычныя і рытуальна-абрадавыя кантэксты ўжывання фундаментальнай катэгорыі «першае» ў міфапаэтычнай мадэлі свету беларусаў. Сцвярджаецца, што з дапамогай гэтага колькаснага паказчыка нашы продкі адмяжоўвалі сферу сакральнага, нябеснага, звязанага з часам першатварэння, ад прафаннага, будзённага, шматразова паўторанага ў жыццядзейнасці соцыума.*

Канцэптуальнай асновай міфапаэтычнай мадэлі свету беларускага народа з'яўляецца палярызаванае процістаянне асноўных параметраў (прызнакаў, якасцей, характарыстык, колькасных паказчыкаў, часавых і прасторавых маркёраў), якія вызначалі і пры дапамозе якіх чалавек асэнсоўваў не толькі кантынуум свайго існавання, але і маральна-этычную парадыгму міжасабовых і міжродавых узаемаадносін. Культурафарміруючымі канцэптамі гэтай парадыгмы былі катэгорыі жыцця і смерці (эсхаталогіі: «Бог даў, Бог узяў»), дабра і зла, мінулага і будучага, свайго і чужога, асвоенага і неасвоенага, мужчынскага і жаночага, правага і левага, цотнага і няцотнага. Некаторыя з навукоўцаў, якія даследуюць міфапаэтычныя асновы славянскага светапогляду, лічаць, што колькасць такіх сістэмаўтвараючых бінарных апазіцый можа дасягаць да дваццаці пяці.

Адным з найбольш прыярытэтных супрацьпастаўленняў можна назваць апазіцыю *пачатак / заканчэнне* або *першае / апошняе* — «семантычная апазіцыя, звязаная з паняццямі часу, ліку і парадку, адзнакі. *Першы* сімвалічна азначае «пачатковы», «новы», «лепшы», «галоўны», «важны», «шчаслівы», а апошні — «канчатковы», «завершаны», «благі», «нешчаслівы» [3, *747*] (хаця ў шматлікіх выпадках *першае* не абавязкова вымагае наяўнасці *апошняга* ў плане рытуальнай закальцаванасці, напрыклад, статусам распачынання, пераходу з аднаго фізіялагічнага стану ў іншы лічыліся *першыя* месячныя, а затым і *першая* шлюбная ноч, аднак гэтыя важныя сацыякультурныя маркёры не прадугледжвалі рытуалізацыю іх апазіцыянераў). *Першае* можа супрацьстаяць шматлікасці наступнага, але пры гэтым не патрабаваць абавязковасці завяршэння, замыкання, закальцавання, рытуальнага заканчэння рытуальным дзеяннем распачатай справы. На падставе часавай палярызацыі («гэта было тады, калі Бог па зямлі хадзіў», «жылі-былі… і сталі жыць-пажываць») будавалася кампазіцыя найбольш старажытных касмаганічных міфаў, а затым багатая духоўная спадчына беларускага этнасу: казачны эпас, балады, абрадавая і пазаабрадавая лірыка і такая важная складовая частка народнай медыцыны, як жывое слова лекара — замовы. Гэта бінарная апазіцыя стала фактычна структура- і сістэмаўтваральнай у пабудове ўсіх рытуальна-абрадавых комплексаў каляндарнай і сямейнай накіраванасці, у аказіянальных абрадах, шмат у чым прадвызначала характар розных аспектаў гаспадарчай дзейнасці чалавека (сяўба, жніво, будаўніцтва хаты, выпасванне хатняй жывёлы).

**_Міфалагема пачатку была адным з найважнейшых архетыпаў у міфапаэтычнай спадчыне беларусаў._**

Міфалагема *пачатку* была адным з найважнейшых архетыпаў у міфапаэтычнай спадчыне беларусаў. Яна парадкавала прастора-часавы кантынуум і вылучала ў міфапаэтычнай мадэлі свету каардынаты месцазнаходжання чалавека, прычым вылучэнне адбывалася як па прынцыпе лакалізацыі прасторавых маркёраў, так і шляхам акрэслівання часавых каардынат. Міфалагема *першага-пачатку* ўвасабляла сабой прынцыповае размежаванне паміж хаосам і гармоніяй, неасвоеным прыродным асяроддзем і сядзібай як часткі айкумены асвоенай і прысвоенай чалавекам, паміж адпаведнымі гарызонтамі часу (мінулае — цяперашняе — будучае), фіксавала мяжу паміж прасторай дабра і зла, размяжоўвала свет жывых і свет памёршых.

Пачатак любой справы ў жыццядзейнасці сям'і або роду, вясковай абшчыны, якая мела абавязковы працяг (адпраўленне ў далёкую дарогу) або шматразовую паўтараемасць (пасля першага выгану хатняй жывёлы на пашу будзе і шмат іншых, аднак яны не будуць мець акцэнтаванага рытуальнага суправаджэння, хаця некаторыя элементы засцерагальнай магіі будуць актуалізавацца штодзень), суправаджалася адпаведным дзеяннем, прамаўленнем спецыяльнай сакральна-магічнай формулы: благаслаўленнем, пажаданнем, замовай. Напрыклад, працяглы час людзі займаліся пасадкай бульбы, але для таго, каб ураджай быў лепшым, трэба было ўзяць тры *першыя* бульбіны, пакласці

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

ў шапку гаспадара (каб увосень клубні былі па галаве), пакруціць яе тры разы па сонцы і толькі пасля гэтага пасадзіць у *першую* баразну [АА, 3]; на Вялікдзень у адным з Мінскіх храмаў мы ўбачылі, як разам з іншымі стравамі, прыгатаванымі для асвячэння, некаторыя жанчыны клалі на ручнік па чатыры бульбіны. На пытанне: «Навошта асвячаць бульбу?» — адна з жанчын адказала: «Каб быць з ураджаем, *першымі* ў баразну трэба пакласці менавіта гэтыя!»; лічылі, калі «*першыя* бульбіны пасадзіць цяжарная, то ўраджай будзе вельмі багаты» [6, *312*]; «*першы* кош бульбы засыпалі ў той дзень тыдня, калі было Благавешчанне» [6, *313*].

Такім чынам, выкананне нескладанага дзеяння або разгорнутага рытуальна-абрадавага комплексу, у аснове якіх ляжыць сімвалізацыя (наданне статуса выключнасці) *першага* або *пачатку,* накіравана на абавязковае размежаванне звычайнай паўсядзённасці (прафаннай плыні часу) і распачынання запланаванай, прымеркаванай да канкрэтнага дня справы, або нечакана ўзнікшай (аказіянальныя сітуацыі, звязаныя з пажарам, хваробай чалавека, хатняй скаціны). Абрадавая маніфестацыя пачатку прадугледжвала спыненне прафаннага часу і праз перыяд бязладдзя запусціць механізм працідзеяння і статуснага вылучэння часу і аб’екта з плыні паўсядзённасці і ўключэння ў абрадавы час. Момант актуалізацыі гэтага працідзеяння і надзяляўся статусам сакральнасці (некалі багі, а пазней людзі пачыналі тварыць-ствараць-дзейнічаць у адпаведнасці з традыцыяй, дадзенай багамі). Праз выкананне рытуалу *пачатку* чалавек імкнуўся запраграмаваць, змадэляваць чакаемы вынік (абапіраючыся на ўласны вопыт і практычны вопыт сваіх папярэднікаў) або загадзя прадвызначыць жадаемае развіццё падзей (у гэтым выпадку ў канструяванні абрадавых падзей спрацоўваў прынцып падабенства).

Аналіз значнай колькасці абрадавых сітуацый і кантэкстаў сведчыць пра тое, што дзеянні, скіраваныя на сакралізацыю *пачатку,* выконвалі наступныя функцыі:

— канструявалі, структурыравалі, упарадкоўвалі прастору і час (напрыклад, *першыя* галінкі асвячонай вярбы гаспадар утыкаў ва ўсе куты свайго надзелу, каб захаваць урадлівасць глебы, перасцерагчы палетак ад граду, перуна, патравы чужой жывёлай [8, *187—189*]; кожная фаза месяца знайшла сваё адлюстраванне ў народнай культуры, аднак найвышэйшым статусам (станоўчы ўплыў на жыццё чалавека і розныя бакі яго гаспадарання) была надзелена *першая* чвэрць — маладзік;

***Сімвалізацыя пачатку, або магія першага, мае ўсеабдымны характар, закранаючы пры гэтым астракасмічныя фактары, шырокае кола аспектаў гаспадарчай дзейнасці, каляндарнай і сямейнай абраднасці, а таксама шэраг аказіянальных сітуацый.***

— узводзілі сімвалічную мяжу (у *першы* дзень выгану жывёлы на пашу пастух тройчы абыходзіў сабраны на полі статак, цягнучы пры гэтым за сабой забітага ваўка) і ставілі своеасаблівы экран ад негатыўнага ўздзеяння акаляючага асяроддзя;

— сакралізавалі *першае* як тое, што не належыць чалавеку (нават зробленае ўпершыню яго рукамі), а павінна быць адрасавана Богу (багам) або далёкім продкам. Напрыклад, існавала павер’е: стары гаспадар у новай хаце доўга не пражыве, хата абавязкова запатрабуе ахвяру. Але каб перасцерагчы яго, *першым* у хату пускалі пеўня ці ката, якія і павінны былі стаць ахвярай дамавіку. Лічылася, што ў новым годзе пашанцуе той сям’і, якую *першым* наведае мужчына.

Вядома пашыранае правіла народнай культуры: каб дзіця было *першым* па жыцці, усюды паспявала і ў яго «ўсё гарэла ў руках», цяжарная жанчына павінна была ў час набажэнстваў стаяць у храме бліжэй за ўсіх да алтара [АА, 5]. Калі ў будзённыя дні гаспадыня выпякала бліны, то *першы* блін яна аддавала дзецям, «каб Бог часцей даваў бліны на ўсіх долю» [6, *579*]. або таму дзіцяці, якое хацелі, каб было *першым* па жыцці [АА, 3]. Разам з тым добра ведалі, што *першы* блін, спечаны на вялікае свята, пакідалі продкам, яго адкладвалі на талерку і ставілі ў чырвоны кут пад абразы. Нездарма ж казалі: *Першы* блін комам. *Першы* блін, спечаны на Багатую Куццю выкарыстоўвалі дзяўчаты для варажбы аб замужжы [5, *9*].

У народнай свядомасці існавалі два падыходы да разумення *пачатку* як кропкі адліку чагосьці новага. *Першы* з іх быў увасабленнем абсалютнага пачатку як акта першатварэння, другі — упісваўся ў кантэкст сучаснасці, але ў сімвалічным плане выконваў ролю таго ж акта першатварэння. А. Байбурын адзначае: «Пачатак новага перыяду з’яўляецца па сутнасці працягам рытуалу, яго другой часткай, арыентаванай на стварэнне парадку, максімальна набліжанага да таго, які быў у «першы раз». Сітуацыя Пачатку аднаўляецца пры дапамозе серыі актуальных пачаткаў, першых дзеянняў, якія маюць падкрэслена рытуальны характар. Усе з’явы, дзеянні, учынкі, якія з’яўляюцца ўпершыню ў новы адрэзак часу, набываюць найвышэйшы семіятычны статус» [1, *146*].

Сімвалізацыя *пачатку*, або магія *першага*, мае ўсеабдымны характар, закранаючы пры гэтым астракасмічныя фактары, шырокі спектр аспектаў гаспадарчай дзейнасці, каляндарнай і сямейнай абраднасці, а таксама шэраг аказіянальных сітуацый. Паспрабуем акрэсліць асноўныя сэнсаўтваральныя кірункі семантычнага поля міфалагемы *пачатку* па характары яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасторава-часавай і сацыякультурнай прымеркаванасці.

### «Як сустрэнеш Новы год, такім ён і будзе», або астракасмічныя фактары *пачатку* і прымеркаваныя да іх параметры традыцыйнага вымярэння часу

Самым высокім семіятычным статусам у традыцыйнай культуры надзелены з'явы астракасмічнага характару. Да іх неабходна аднесці паварот Сонца на новы гадавы круг, якому адпавядае пачатак новага года. З ім звязаны цэлы комплекс атрыбутаў, абрадавых дзеянняў, рытуалаў, варажба, абход калядоўшчыкаў, велічальныя песні, гульні і ігрышчы моладзі, прадказанні надвор'я на блізкі і далёкі тэрмін. Аб гэтым выразна сведчыць кароткі, але ёмісты па сваім зместавым напаўненні фразеалагізм «як сустрэнеш Новы год, такім ён і будзе».

Выключным сакральным статусам надзелены *пачатак* новага дня — усход Сонца і асабліва ў вялікія святочныя дні: напрыклад, вядома шырока распаўсюджанае прадпісанне пакупаць дзяцей да ўзыходу сонца ў *Чысты чацвер* (пакуль воран сваіх дзяцей не пакупае), на *Вялікдзень* і *Купалле* назіралі за ўзыходам сонца, таму што існавала павер'е аб тым, што ў момант узыходу яно «іграе».

Міфапаэтычная спадчына беларускага народа дае шмат падстаў для таго, каб гаварыць аб тым, што нароўні з Сонцам важнае месца займала ўсебаковае асэнсаванне фазаў Месяца. З *першай* чвэрцю Месяца — *маладзіком* — звязана вялікая колькасць распачынанняў земляробчых і сельскагаспадарчых работ: «У маладзіковы тыдзень у Беларусі звычайна пачынаюць сеяць, жаць, касіць і выконваць іншыя сельскагаспадарчыя работы, гледзячы па тым, што абяцае маладзік — пагоду ці дождж, мароз ці адлігу. Селяніну-земляробу... было вельмі лёгка, канешне, заўважыць, што з надыходам маладзіка вельмі часта мяняецца надвор'е, а таму — не дзіва, што маладзіковы тыдзень і да гэтага часу займае значнае месца ў беларускіх народных прыкметах» («Віленскі веснік», № 79, 1893.) [7, *50*].

Станоўчым лічыцца ўплыў *маладзіка* на долю чалавека, яго здароўе, магчымасць стварэння сям'і. Чалавек, які нарадзіўся на *маладзік*, будзе даўгавечны, рухавы, лёгкі на пад'ём — «*быццам бы маладзік*» [АА, 5]. Менавіта да гэтага часу прымяркоўвалі вяселлі ў народным асяроддзі [19, *149*]:

*— Маладзенькі малойчык,*
*Што ў цябе на куцеззяе?*
*Ці не месяц узышоў?*
*Дзевачкі, мае сяструцы,*
*ды ў мяне на куце ззяе*
*дзевачка маладая!* [4, *157*].

Адпаведна фазам месяца структурыруецца вымярэнне часу працягласцю ў адзін тыдзень. Сімвалізацыя *пачатку* гэтай адзінкі набыла розныя характарыстыкі ў народнай і хрысціянскай традыцыях. *Першы* дзень тыдня — нядзеля — у хрысціянскай культуры з'яўляецца вяршыняй акта *першатварэння* Свету і пачаткам існавання новага часу. У той жа час у народнай традыцыі ўтрымліваецца негатыўнае стаўленне да *першага* дня тыдня: панядзелак — дзень цяжкі.

Статус міфалагемы *першы* прадвызначаўся класічным прынцыпам народнай светапогляднай канцэпцыі: як пачнеш, так яно і будзе (як не пашанцуе раніцай, дык не пашчасціць і вечарам; нарадзіцца ў добрую часіну; ведай, калі сяўбу распачаць, ведай, у які дзень бульбу або цыбулю выбіраць, каб добра захоўвалася на працягу ўсёй зімы).

Магія *пачатку* або сімволіка *першага* была шырока прадстаўлена ў каляндарнай абраднасці, перш за ўсё ў святах, якія распачыналі той ці іншы перыяд года або цыкл земляробчых работ. Вялікую ўвагу надавалі і *першаму* дню посту. Так, на Гомельшчыне сачылі за тым, каб ніхто з дамачадцаў не працаваў у першы дзень Вялікага посту, «каб чэрві не заводзіліся ў сыры» [3, *674*].

Важнай падзеяй у структуры календара былі Каляды. Яны распачыналі новы год, таму паводзіны членаў кожнай сям'і паасобку і ўсёй вёскі ў цэлым у *першую* калядную раніцу мадэліравалі іх жыццё на ўвесь надыходзячы год. Асаблівай увагі заслугоўваў *першы* дзень Новага года, а *першая* святочная вячэра распачыналася з узыходам на небе *першай* зоркі. *Першую* лыжку куцці (спецыяльнай рытуальнай кашы) клалі на акно або на парог, яна была адрасавана продкам. У *першую* навагоднюю ноч моладзь варажыла аб тым, хто *першы* пойдзе замуж.

Е. Р. Раманаў падае наступнае апісанне калядных клопатаў беларускіх сялян: «Каб скаціна лепш вялася, трэба *першыя* бліны ад кожнай Куцці і ад святаў Раства, Новага года і Вадохрышча — усяго шэсць бліноў — засушыць і, расцершы іх, усыпаць у корм. Адны гаспадыні робяць гэта на Вадохрышча, другія — на Юр'я (6 мая)» [14, *302*].

З Калядамі звязаны рытуал, які павінен быў уплываць на стан здароўя чалавека. У *першы* дзень Каляд, калі ў хату прыносілі свежую ваду, гаспадар браў дробную срэбную манету і кідаў у вядро. Затым пачынаў маліцца і мыцца сам, а за ім і астатнія члены сям'і: меркавалі, што твар пасля гэтага не будзе «псавацца» на працягу года ні ад вялікай спякоты, ні ад траскучых маразоў [9, *166*]. Добра ведалі: хто на Вадохрышча набярэ *першым* вады ў храме, той увесь год будзе наперадзе ўсіх. Каб на працягу года сям'я жыла заможна, нічога і нікому не пазычалі ў *першы* дзень Новага года, а таксама на Вялікдзень і Раство Хрыстова [12, *272*]. Разам з тым ведалі, што прадаючы тавар у першы дзень новага года, трэба зрабіць скідку *першаму*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пакупніку, каб увесь год гандаль быў удалым і абавязкова падгадвалі, каб гэтым *першым* аказаўся мужчына [7, *511*].

Лічылася, калі на Каляды *першым* чыхне мужчына, будуць радзіцца бычкі і баранчыкі, а як жанчына — цёлачкі і авечкі [18, *76*].

*Пачатак* новага года даваў магчымасць зазірнуць у будучыню. Менавіта з гэтым часам звязана самая вялікая колькасць варожбаў: «сабраўшыся ў адну хату, дзяўчаты пякуць з мукі булачкі велічынёю з курынае яйка, кладуць іх у рад і выклікаюць сабаку: чыю булачку ён возьме *першую* — тая *першая* і выйдзе замуж» [5, *19*; 22, *41*].

## Сімвалізацыя *пачатку* ў гаспадарчай дзейнасці чалавека

Можна з упэўненасцю сказаць, што практычна кожнае новае ўтылітарна-практычнае дзеянне, распачынаемае *ўпершыню* ў жыцці чалавека або ў новым цыкле гаспадарчай дзейнасці, набывала ў свядомасці народа выключнае, сакральна-магічнае значэнне, яму надаваўся ўласна абрадавы статус, які, зразумела, патрабаваў ад чалавека абавязковага выканання шматлікіх рэгламентацый (забаронаў, абмежаванняў, пажаданняў, прадпісанняў), якія дакладна рэгулявалі не толькі выкананне абраду, але ўплывалі на паводзіны чалавека напярэдадні (перад тым, як біць кабана і складваць у кубелец саланіну, муж і жонка не павінны былі ўступаць у шлюбныя адносіны, каб сала «не запышкарыла», не «паслюзла» [АА, 4], у той дзень, непасрэдна ў час разгортвання абрадавай дзеі (у час сяўбы) нельга было зрабіць адпачынак, каб штонебудзь паесці, — ніва не ўродзіць [7, *270*]), а ў некаторых выпадках і ў бліжэйшы час пасля заканчэння асноўнага рытуалу (у дзень сяўбы або ў дзень хрышчэння дзіцяці не дазвалялася выконваць якія-небудзь іншыя важныя справы [13, *136*]).

Калі пачыналася закладка новай хаты, то ўсё, што рабілася ўпершыню, надзялялася статусам выключнай важнасці. У *першы* дзень можна было звязаць толькі *першы* вянец — падваліны, пры гэтым майстры сачылі, у які бок паляціць першая трэска: калі ў сярэдзіну будучай хаты — сям'я будзе жыць у дастатку, калі ж у вонкавы бок, то лічылі, што ўсё дабро сыйдзе з хаты, а людзі ў ёй будуць паміраць [3, *677*]. Абрадавы характар маюць і такія этапы будаўніцтва, як выразанне *першага* акна, укладанне *першай* бэлькі, узвядзенне *першай* крохвы [1, *163*].

Складаны і працяглы этап асваення новага жытла нагадваў гісторыю развіцця чалавечай цывілізацыі. Крок за крокам хата напаўнялася неабходнымі атрыбутамі-спадарожнікамі жыцця і працы, паступова ажывала, набывала прыкметы жыцця, у яе з'яўлялася свая душа або дух-ахоўнік — дамавік. У працэсе «ажыўлення» хаты і адначасовага ўжыўлення чалавека ў космас толькі што створанага сялянскага жытла прыкметную ролю выконвалі: улазіны, якія спраўлялі ў *першую* нядзелю *маладзіка*, дзень, калі закладвалі печ і *першы* раз у ёй палілі, калі закладвалі *першы* ручнік у кросны, калі нараджалася *першае* дзіця і спраўлялі *першае* вяселле. На Палессі ў *першы* дзень у новай хаце забаранялася месці падлогу, каб не вымесці з хаты родных [18, *675*].

У перыяд паміж веснавым і восеньскім раўнадзенствамі жыццё земляроба поўнілася гаспадарчымі справамі. Распачынанне кожнай з іх суправаджалася выкананнем спецыяльных абрадавых дзеянняў або ўвядзеннем у паводзіны гаспадароў шматлікіх забаронаў і рэгламентацый. Найбольш адказным быў *пачатак* сяўбы якой-небудзь культуры.

Нашы продкі былі перакананы: «Хто *першы* пачынае араць, той *першым* будзе ва ўсіх работах на полі» [9, *92—93*]. У *першы* дзень засявалі толькі невялікую частку поля, а пасля гэтага не займаліся ніякімі важнымі справамі: «*Першы* дзень палявых работ бывае своеасаблівым святам у сельскай сям'і: селянін працуе нядоўга і ўвесь клопат у тым, каб толькі пачаць» [7, *257*]. Прычым *першая* жменя жыта павінна быць асвечана ў дзень *Першай* Прачыстай [7, *268*]. У *першы* дзень ворыва гаспадар старанна мыўся і апранаў чыстую вопратку, каб збажына была чыстая ад зелля, запрагаў валоў у саху, абыходзіў іх тры разы з поўным вядром вады, абліваў той вадою, каб у іх хапіла сілы на ўсе веснавыя работы [18, *87*]. Аналагічнае рытуальнае дзеянне выконваў бацька, калі маладыя адпраўляліся ў храм на вянчанне. З поўным вядром вады ён тройчы абыходзіў увесь вясельны картэж, а затым выліваў ваду пад колы *першай* павозкі. Моманту сяўбы папярэднічаў шэраг прадпісанняў: у гэты дзень катэгарычна забаранялася каму-небудзь што-небудзь пазычаць, перад гэтым сейбіт павінен быў памыцца ў лазні, апрануцца ў чыстае, а гаспадыня імкнулася навесці ў хаце выключны парадак. Калі ж пачыналі садзіць агарод, то *першую* граду нельга было садзіць ад плоту [7, *260—261*]. У *першы* дзень жніва зажыналі толькі адзін (*першы*) сноп, яго на працягу года захоўвалі ў чырвоным куце пад абразамі (зерне з яго каласоў выкарыстоўвалася ва ўсіх сямейна-родавых абрадах) [17, *68*]. Па некаторых прыкметах прадказвалі ўраджай на новы год. Так, напярэдадні *Першага* Спаса варылі столькі яек, колькі ў двары мужчын. За абедам кожны выбіраў яйка з місы і разбіваў яго. Той, у каго яно паўней, *першым* пойдзе засяваць жыта, каб так поўна было на налецце ў свіране. Цікавы спосаб барацьбы з пустазеллем прапаноўвалі інфарматары беларускага фалькларыста А. К. Сержпутоўскага: «Калі на полі расце паганае зелле, то яго трэба пераараць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тымі сашнікамі, што падвараны ў першую пятніцу» [18, *95*].

У жывёлагадоўлі таксама існавала правіла ўшанавання *першага* або *пачатку*. Калі куплялі карову і прыводзілі ў двор, то стараліся, каб яе *першы* раз у варотах сустрэла цяжарная жанчына, што, па народных уяўленнях, магло забяспечыць штогадовы прыплод ад гэтай жывёліны; *першы* раз «упіхвалі яе ў хлеў задам наперад, каб яна не баялася падзіву і не цуралася свайго хлява» [18, *78*]; ніколі не прадавалі *першае* цяля, бо меркавалі, што тым самым перапынялася плоднасць жывёліны, пагаршалася яе малочнасць [АА, 5].

Асаблівым рытуальным статусам надзяляўся *першы* выган жывёлы ў поле. У гэты дзень гаспадыня выконвала шэраг магічных рытуальных дзеянняў, з дапамогай якіх яна мадэліравала ўсе тыя жадаемыя аспекты і мяркуемыя вынікі, якія былі зарыентаваны на захаванасць прыбытку і дабрабыту. На досвітку, якраз перад узыходам сонца, гаспадар браў вядро і спяшаўся да таго месца, дзе сыходзіліся два ручаі (а яшчэ лепш, калі тры), зачэрпваў ваду толькі па цячэнні і рушыў дадому. Тым часам гаспадыня выганяла карову ў двор і тройчы па сонцы абводзіла яе чырвоным велікодным яйкам — каб на працягу года жывёліна была гладкая. Як толькі гаспадар прыносіў ваду, гаспадыня тройчы абмывала ёю пысу і вымя, «каб была няўрочная і малочная» [8, *246—271*].

Калі ж па вёсцы разлятаўся добра знаёмы гук пастушага рога, гаспадыня брала галінку асвячонай вярбы і выганяла жывёліну на вуліцу. Але перад гэтым у варотах клала некалькі прадметаў, якім таксама надавалася магічная роля, — замкнёны замок (каб замкнуць пашчы ваўкоў), праз яго дужку прапускалі пояс або рэмень (каб скаціна штодня вярталася дадому), чырвонае велікоднае яйка (каб прынесла прыплод) і сальнічку з асвячонай велікоднай соллю (каб ніхто не сурочыў і не забраў малако). «У дзень *першага* выгану жывёлы ў поле пад парог хлява клалі навойчык ад кроснаў, і калі карова пераступіць яго, то ўжо значыць не адаб’ецца ад чарады; дзе б ні згубілася ў лесе — абавязкова прыйдзе дадому» [6, *434*]. На Віцебшчыне асобныя гаспадыні выконвалі складанае абрадавае дзеянне, якое суправаджалася большай колькасцю сакральных атрыбутаў: «перад *першым* выганам скаціны на пашу ля парога хлява кладуць: замок, нож, кажух поўсцю навыварат, хлеб і яйка, каб: а) скаціна была гладкая, як яйка; б) каб у непрыяцеля замкнуліся рукі, а ў звера пашча; в) каб скаціне была простая дарога да дому і г) каб яе напладзілася столькі, колькі ў кажуху шарсцінак. Скаціна выганяецца са двара асвечанай вярбою і пераступае цераз пакладзеныя ля парога прадметы, пасля чаго пастух апранае кажух, падпярэзваецца папругаю, кладзе хлеб і яйка запазуху, а замок падвешвае да дзвярэй хлява ці бярэ яго ў поле, дзе ўвесь час трымае ў кішэні. У некаторых мясцінах усе гэтыя прадметы застаюцца некранутымі да загону скаціны ў хлеў. Калі якая-небудзь жывёліна расплюсніць пакладзенае ля парога хлява яйка, то воўк з’есць гэтую жывёліну» [13, *177*].

Каб статак не расходзіўся, каб ніводную карову не загрызлі ваўкі, у *першы* дзень пастух абыходзіць чараду тры разы [18, *77*].

На працягу ўсяго перыяду выпасу гаспадыня штодзень выганяла жывёліну ў поле без выканання якіх-небудзь рытуальных дзеянняў, але ўвесь час, па народных уяўленнях, «працаваў» ахоўны патэнцыял рытуальнай перасцярогі, змадэліраванай у дзеяннях *першага* выгану.

У паўночных раёнах Беларусі існавала павер’е, што «добраму вывaду гусянят вельмі дапаможа зямля з-пад правай нагі, узятая ўвесну, як *першы* раз убачыш у небе дзікіх гусей; гэтаю зямлёй трэба злёгку патрусіць наседжваемые яйкі» [13, *174*].

## Сімвалізацыя *пачатку* ў магічнай практыцы і абрадах сямейна-родавай накіраванасці

Відавочна, што самая значная колькасць рэгламентацый, звязаных з сімвалізацыяй *пачатку,* тычыцца каляндарнай і сямейнай абраднасці беларусаў, а таксама іх шматвяковага вопыту магічнай практыкі. Менавіта ў гэтай сферы дзейнасці чалавека рытуал дакладна і выразна размяжоўваў сакральнае і прафаннае, святочнае і побытавае, першапачатковае і наступнае. А. К. Байбурын слушна сцвярджае: «...*першае* менш за ўсё азначае *пачатак* пералічэння. *Першы* сустрэчны, *першы* блін, *першы* гром і г. д. маюць не нумаралагічны (колькасны) сэнс, а якасны — ім прыпісваюцца нейкія асаблівыя якасці, дзякуючы якім яны вылучаюцца з агульнага шэрага з’яў. Адсюль выцякае і другая асаблівасць: *першае* не абавязкова ўтварае пару з *апошнім*. Хутчэй за ўсё, яго карэлятам будзе «ўсё астатняе», якое належыць да гэтага ж шэрага» [1, *146*]. Рытуал не толькі мадэліраваў жадаемае, але быў скіраваны на тое, каб ураўнаважыць прыродную або сацыякультурную сітуацыю. Напрыклад, калі ўсталёўвалася працяглая засуха, то з мэтай «выклікання» дажджу выконваўся спецыяльны абрад: тры жанчыны-ўдавы збіраліся разам і на ўзыходзе сонца павінны былі абысці дзевяць калодзежаў і пасыпаць у іх мак-відук, асвечаны ў мінулым годзе на *Першага* Спаса.

Навукоўцы даўно заўважылі, што ў сістэме народных прыкмет і павер’яў, забаронаў і прадпісанняў існуе цесная ўзаемасувязь паміж цыклам земляробчых, сельскагаспадарчых святаў і святаў жыццёвага кола чалавека. Тлумачыцца гэта аднолькавым стаўленнем нашых продкаў да жанчыны-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маці, якой Богам наканавана працягваць жыццё, і да матухны-Зямлі, якая падтрымлівае, сілкуе жыццё чалавечага роду. У выніку атрымалася, што пэўныя рытуальныя дзеянні чалавека маглі паўплываць на ўрадлівасць зямлі, а свяшчэннае стаўленне да яе — нават на шчаслівы зямны шлях чалавека. Напрыклад, лічылася, што гушканне моладзі перадшлюбнага ўзросту на арэлях аказвала ўплыў на хуткі рост ільну-даўгунцу. І наадварот, «калі першы раз выйшаўшы вясною араць, знойдзены ў першай скібе першы каменьчык захаваеш і ўкінеш дзяўчыне ў хвартух — будзе мець на гэты год дзіця» [6, *41*].

Існуе шэраг прыродна-касмічных фактараў, якія не маюць дакладнай часавай прымеркаванасці, але разам з тым могуць аказаць істотны ўплыў на фізічнае здароўе, псіхалагічны стан чалавека, а таксама прадказваць, якім будзе год, які будзе сабраны ўраджай і г. д. Сюды адносяцца шматлікія прадказанні, звязаныя з аднаўленнем прыроднага цыкла жыцця (у непасрэднай сувязі стану прыроды і існавання чалавека): калі *першы* гром прагрыміць на «голы» лес або «як яшчэ на рацэ лёд», то вясна будзе халодная, а год — галодны [18, *32, 42*]; калі *першы* раз загрыміць, трэба схапіцца за камень, «то будзеш такі здаровы, як і камень» [7, *70*]; пачуўшы *першы* гром, трэба было стаць спінай да дуба, каб цэлы год не балела спіна; «пакачацца па зямлі, каб не хварэць на вадзяную хваробу» [7, *71—72*]; «павінен «чраз галаву куляць», каб грому не баяцца» [2, *72*]; «У Іўеўскім раёне казалі, што ад такога куляння дзеці будуць хутка расці. На Палессі казалі, што гэтым захаваеш сябе ад галаўнога болю на цэлы год. Пасля першага грому нельга хадзіць басанож» [7, *73*]; пачуўшы *першы* гром, «дзяўчаты бягуць да ракі, мыюцца і выціраюцца чым-небудзь чырвоным, каб быць багатымі і прыгожымі» [7, *70*]; «бабы бяруць вядро, на раку мыцца ідуць, прыносяць воду дамоў, абмываюць дзяцей. Гром грыміць: вясна сапраўдная» [7, *71*]; як *першы* раз пачуеш зязюлю, «а маеш тады грошы, то будзеш цэла лета знаходзіці то грошы, то капейку, то дзве, то тры, — і ўсё будзеш знаходзіці да знаходзіці» [7, *512*]; «добра мець у кішэні грошы, добра быць у вясёлым настроі, — цэлы год будзеш адчуваць задавальненне, весялосць» [7, *171*]; «пры *першай* сустрэчы маладзіка трэба: а) узяцца за галаву, каб воласы лепш раслі; б) патрасці грашыма ў кішэні ці крануць якую-небудзь залатую ці срэбную рэч, якую маеш пры сабе, каб грошы не пераводзіліся цэлы месяц» [13, *218*].

З дзяцінства памятаю, як мы чакалі прылёту буслоў. Заўсёды хацелася ўбачыць *першага* з іх у палёце, бо верылі, што гэта прадказвала здароўе і бадзёрасць на ўвесь год. Калі ж убачыць бусла, які сядзіць у гняздзе, трэба было чакаць хвароб і непрыемнасцей. А калі падаў *першы* снег, вучылі працерці твар і прагаварыць: «Сняжок упаў, Бог здароўе паслаў».

У большасці сваёй рытуалы сакралізацыі *першага* былі зарыентаваны на атрыманне адпаведнага выніку. Пунктам перасячэння дзвюх часавых прастораў існавання зноў-такі быў *пачатак.*

Выключна багата прадстаўлена міфалагема *першы* ў радзільна-хрэсьбіннай абраднасці і паэзіі. Калі ў сям’і нараджалася *першае* дзіця, то для яго рабілі новую калыску. Але абавязкова раілі, каб бацька прымаў у гэтым самы актыўны ўдзел: «хоць што-небудзь дарабіў у калысцы ці хоць прывязаў вяровачку». Тады дзіця будзе шанаваць бацькоў [18, *155*]. У народзе існавала пераканананасць, што «аднаполыя блізняты амаль заўсёды гадуюцца. А вось з разнаполых хутка памрэ той, які выйшаў *першым*» [13, *98*].

*Першы* раз нованароджанае дзіця бабка-павітуха спавівала ў старое адзенне бацькоў: хлопчыка — у бацькоўскую рубаху, дзяўчынку — у матуліну спадніцу. Гэта рабілася дзеля таго, каб дзеці былі прывязаны да бацькоў, любілі і паважалі іх у старасці [16, *658*].

*Першы* раз нованароджанага маці павінна была прыкласці да грудзей справа, каб не стаў леўшаком, каб дзіця не мела «благое вока» [6, *110*]. І толькі пасля *першага* кармлення маці надзявала на дзіцятка *першую* кашулю, якую шылі як мага прасцей «без каўнерыка і без навароткаў у швах» для таго, каб яно не было ўпартае, а расло паслухмяным [13, *23*].

Вялікую ўвагу надавалі *першаму* рытуальнаму купанню дзіцяці [17, *658*] (*першаму*, таму што пасля смерці будзе выканана апошняе рытуальнае купанне, якое будзе скіравана на тое, каб «змыць» з чалавека сляды яго зямнога існавання [6, *261*]). Яно было з’арыентавана на тое, каб «запраграмаваць» перспектывы яго будучага жыцця. З гэтай мэтай у ваду для купання клалі спецыяльныя рэчы: «...на Палессі звычайна соль і асвячоныя травы, у іншых месцах — сярэбраную манету, каб дзіця вырасла чыстае, як срэбра, здаровае і багатае; ...асвячоную на Іярдане ваду... засцерагчы ў будучым ад злых вачэй...». Калі дзіця пасля *першага* рытуальнага купання пакласці на правы бок, яно будзе «праўшаком», а калі на левы — «леўшаком» [6, *105*; 11, *34—35*; 18, *172*]. Заўважым, што адзенне, у якое апраналі дзіця пасля *першага* рытуальнага купання, набывала статус выключнасці: яго, як правіла выкарыстоўвалі яшчэ раз толькі падчас хрышчэння, а потым клалі асобна і перадавалі наступным дзецям для выкарыстання зноў-такі ў тых жа самых абрадавых сітуацыях. Гэта было знакам таго, што дзеці, якіх апраналі ў адно і тое ж абрадавае адзенне, будуць дружыць паміж сабой.

На той выпадак, калі ў сям’і «не гадаваліся», г. зн. паміралі дзеці, у народнай культуры было выпрацавана шмат контрхадоў. Але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самым распаўсюджаным і вядомым было ўзяць для наступнага народжанага дзіцяці «стрэчных» кумоў — «*першых* стрэчных, г. зн. тую *першую* пару, якую стрэнуць на вуліцы»; «*першых* стрэчных мужчыну і жанчыну»; «запрашэнне «збожжых кумоў» (г. зн. выпадковых). Бацька народжанага сам чакае на «ростанях» праезджых і прахожых: *першых* сустрэтых мужчыну і жанчыну запрашаюць у кумы, хай сабе нават яны і старцы» [6, *126*]. Верылі, чым далей пойдуць гэтыя падарожнікі пасля абраду хрышчэння, тым болей пражыве дзіця. Яшчэ і сёння існуе правіла ў дачыненні да хросных, якія *ўпершыню* хрысцілі дзяцей: «дзяўчына павінна старацца *першы* раз хрысціць хлопчыка, а хлопец — хрысціць дзяўчынку; тады яны хутка пажэняцца і павыходзяць замуж» [14, *306*]; «тая дзяўчына будзе мець шмат прыхільнікаў, у якой *першы* хрэснік быў хлопчык. У сваю чаргу і мужчына павінен мець *першую* хрэсніцу, калі хоча, каб за ім ганяліся дзеўкі» [6, *184*]. У адваротным выпадку часцей за ўсё кумоў чакала адзінота. На пытанне, якое я задаваў у розных куточках Беларусі: «А чаму так?» — старыя людзі адказвалі аднолькава: «Так долю сваю аддалі, хросная — дзяўчынцы, а хросны — хлопчыку». Акрамя гэтага было заўважана, што «ў большасці выпадкаў здараецца так, што мужам (жонкаю) становіцца асоба з тым імем, якое дадзена было пры хрышчэнні *першаму* хрэсніку (хрэсніцы)» [13, *50*].

Сімволіка *першага* прасочваецца і ў кантэксце хрэсьбін. Гаспадар браў чарку і ішоў на покуць, дзе сядзелі кумы. Наліваў *першую* чарку, падносіў да вуснаў і гаварыў: «Ну, бабка (парадзіха, якая ляжыць ў ложку) і вы, кумочкі, і ўсе дарагія госцікі! Будзьце здаровенькі!» [15, *107*].

Любая падзея ў жыцці нованароджанага ўспрымалася як ўрачысты акт, які суправаджаўся спецыяльнымі рытуальнымі дзеяннямі: *першы* самастойны крок «перарэзваннем путаў»: той, хто *першым* заўважыў самастойны крок дзіцяці павінен быў некалькі разоў правесці па падлозе нажом паміж ног дзіцяці [11, *84*; 20, *198*]; *першы* выпаўшы малочны зуб кідалі за печ, каб астатнія трымаліся доўга, пры гэтым абавязкова звярталіся да мышкі, якая там жыве [11, *83*]. На працягу *першага* года дзіцяці не стрыглі валасы, «каб не застрыгчы мову і памяць» [11, *90*]; на працягу *першага* году жыцця нельга было «падносіць дзіця к люстэрку ці к вадзе, каб яно не ўбачыла там сябе», «каб не балелі вочкі» [18, *183*]; не аддавалі адзенне дзіцяці, яго калыску, ложак [АА, 4].

Роўна ў год праводзілі абрад *першага* пастрыгу: «*Першы* раз стрыглі ў год, маці сама стрыгла» [15, *60*; 18, *185*; 11, *90—91*], валасы якога клалі за бажніцу і захоўвалі на працягу ўсяго жыцця [10, *325—333*].

Каб дзіця было ахвотнае да працы, раілі «*першую* работу» ўкласці ў рукі ў той дзень, у які яно нарадзілася [18, *185*]. Разам з тым сімвалізацыя *першага* ў дачыненні да дзіцяці мела пэўныя разначытанні. У адной мясцовасці забаранялася даваць дзіцяці *першы* спечаны блін, «бо не хутка чытаць навучыцца» [6, *150*], і наадварот, лічылася, калі *першы* блін аддаваць дзіцяці, то яно будзе «*першым* па жыцці». Відаць, асэнсаванне першага як таго, што адрасавана багам і продкам, вымагала «*першыя* самастойныя вырабы дзіцяці трэба спаліць (знішчыць) на вачах у дзіцяці — тады яно будзе ахвочае да працы» [15, *100*].

У Веткаўскім раёне маці, у якой памерла *першае* дзіця, катэгарычна забаранялася «праводзіць яго «на клодаўя», інакш і наступныя дзеці будуць паміраць». У Докшыцкім раёне жанчына, у якой памерлі дзеці, падчас збору ягад *першыя* тры павінна была кінуць на зямлю [6, *160*].

Сімволіка *пачатку* шырока прадстаўлена ў вясельным абрадзе. Сэнсавыя межы сімволікі *першага* часам настолькі шырокія, а асацыяцыі, якія яны выклікаюць, настолькі нечаканыя, што не перастаеш здзіўляцца мастацкаму таленту народа, асаблівасцям яго мыслення, шляхам стварэння вобраза. Напрыклад, калі ў бацькоў было некалькі дачок, то сватацца трэба было спачатку да *першай* па ўзросце [18, *189*]; «як *першы* раз прыйдуць сваты, то няможна згаджацца выдаваць дзеўку, бо маладыя будуць вельмі нешчаслівыя да й людзі насмяюцца, што дзеўку хутчэй збываюць («хоць за вала, абы дома не была»), а трэба сказаць, што дзеўка яшчэ маладая, што мала ў кубле або што іншае, каб сваты дагадаліся і прыйшлі ўдругае і зрабілі славу дзеўцы» [6, *192*]; «Лічылася ганьбай для дзяўчыны, калі яна згаджалася ісці замуж за *першага* ж хлопца, які засылаў сватоў. За гонар лічылася, калі дзяўчыну сваталі 5—6 розных хлопцаў, і толькі пасля гэтага яна ішла замуж» [21, *297*]; калі сваты *першы* раз прыходзілі ў дом нявесты, «яны не павінны сутрымоўвацца каля парога ці сярод хаты, а хутчэй ісці к сталу да садзіцца там на лаву. Калі ж яны супыняцца, то пэўна за таго малайца дзеўкі не аддадуць. Калі сваты, уходзячы ў хату да запнуцца ці спаткнуцца аб параг, то з таго сватання нічога не будзе» [18, *173—174*]. Было крайне не пажаданым, каб малодшая дачка выходзіла замуж паперад старэйшых: пераходзіла ім дарогу. У такім разе неабходна было выканаць дадатковае абрадавае дзеянне. Перад тым, як госці будуць запрошаны за вясельны стол, старэйшая дачка павінна была басяком тройчы па сонцы абысці вакол святочнага стала [АА, 2].

Усе прысутныя і ўдзельнікі праводаў маладых да вянца ўважліва сачылі, за што *першае* возьмецца жаніх. Калі за лейцы — будзе трымаць жонку ў руках, калі за пугу — будзе біць. У гэты ж час мужчыны кідалі шапку, каб *першым* нарадзіўся сын [6, *202*].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Той з маладых, хто *першым* стане на ручнік у час вянчання, будзе лідарам у сям'і. Аналагічныя назіранні тычыліся і вянчання ў храме: «хто, становячыся пад вянец, *першы* ступіць на падножнік, той будзе ў доме за галоўнага. У час шлюбу на падножнік трэба пакласці манету, каб маладыя былі заможнымі» [14, *306*].

Сярод беларусаў існавала перакананасць у тым, што жыццёвая доля маладых шмат у чым залежыць ад таго, хто *першым* з гасцей прыйдзе на вяселле, таму бацькі жаніха або нявесты загадзя дамаўляліся з сваякамі (шчаслівай сямейнай парай, якая мела не менш дваіх дзяцей), каб яны парупіліся і прыйшлі раней за астатніх. Пры гэтым гаспадары забіралі ў іх падарункі, падрыхтаваныя для жаніха і нявесты, і клалі іх у чырвоны кут за бажніцу, каб ніхто не бачыў і не ведаў [АА, 5].

Асобая ўвага ў вясельным абрадзе надавалася *першай* чарцы. У адпаведнасці з законам рытуальнай перавернутасці, на падставе якога разгортваліся абрады супрацьлеглай накіраванасці — вяселля і пахавальна-памінальны, — на жалобных сталах ні *першую*, ні другую, ні трэцюю чаркі дапіваць было нельга («пакінь слязу для памёршага»), а вось на вяселлі «*першую* чарку пі да дна: не пакідай слязу (бяду, гора)». Такім жа высокім сакральным статусам надзяляўся і *першы* кавалак каравая — так званая «доля», якую аддавалі маладым. Асаблівая ўвага ў кантэксце беларускага вяселля надавалася і *першай* шлюбнай ночы маладых. Людзі баяліся таго, каб ліхія на руку аднавяскоўцы не нарабілі маладым бяды, таму ложак для жаніха і нявесты мелі права рыхтаваць або родная маці або хросныя бацькі.

Важнае значэнне магія *пачатку* мела і ў пахавальна-памінальнай абраднасці. Па ўяўленнях нашых продкаў, як толькі *першая* жменя зямлі ўпадзе на труну, душа памёршага канчаткова развітваецца з целам і «ёсць нешматлікія празарліўцы, якія бачаць гэтую душу на выхадзе з магілы — то вясёлую, то заплаканую» [13, *291*]. *Першае*, што трэба зрабіць, вярнуўшыся з могілак: вымыць рукі перад парогам хаты і дакрануцца да печы — «пагрэць рукі» [6, *289*].

*Першым* з могілак выходзіў самы стары, ён жа *першым* заходзіў за памінальны стол і *першым* уставаў з-за яго. Усе стравы, пададзеныя на стол, *спачатку* адкладваліся ў талерку памёршаму [6, *290*]. У *першую* ноч пасля пахавання памінальны стол не прыбіралі: верылі, што душы продкаў прыляцяць і таксама пачастуюцца [6, *291*].

Па ўяўленнях усходніх славян, *першы* пахаваны на новых могілках чалавек станавіўся яго «гаспадаром» [3, *676*]. Таму стараліся *першым* пахаваць адзінокага, бяздзетнага, бессямейнага чалавека, каб «не валок за сабой».

*Першае* — ахвяра багам і душам памёршых продкаў. З даўніх часоў у народнай культуры сфарміравалася класічнае звычаёвае правіла: «*Перш* чым сабе — падзяліся з продкамі». Яно ахоплівае ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека: земляробства, жывёлагадоўлю, каляндарныя і сямейныя абрады. *Першае* заўсёды было доляй багоў і прадстаўнікоў «таго» свету, яно не належала чалавеку. Таму *першыя* плады, *першае* печыва з мукі новага ўраджаю заўсёды мелі не вузка прагматычную, а сакральна-магічную накіраванасць; яны былі ахвярай шматлікім багам-ахоўнікам. Так, напрыклад, нельга было ўжываць яблыкі з маладой яблыні, якая дала *першы* ўраджай; *першы* сноп прыносілі дадому і ставілі ў чырвоны кут пад абразы; *першы* хлеб, спечаны з мукі новага ўраджаю, *першы* блін, спечаны на свята, клалі на талерку і ставілі на дахавае акенца прыносілі ў ахвяру: птушкам, жывёлам, дамавіку, душам продкаў [3, *678*]; такі ж рытуальны сэнс мела і *першая* лыжка каляднай куцці, і *першае* печыва ў выглядзе птушкі, якое кідалі ў печ на Саракі [АА, 6]; жанчынам, у якіх памерлі дзеці, нельга было ўжываць яблыкі новага ўраджаю да Яблычнага Спаса, таму што *першыя* яблыкі трэба было асвяціць у храме і аднесці на магілы дзяцей [13, *253*]; на Радаўніцу *першую* чарку налівалі памёршым, або кожны з прысутных адліваў на магілу некалькі кропель гарэлкі са сваёй чаркі. І апошняе, гаварылі, як сядзеш за стол, то «*першы* кавалак аддай сабаку, няхай ён з'есць, бо ніколі не ведаеш, праз чыю ласку жывеш» [18, *58*].

## Літаратура


1. *Байбурин*, А. К. Жилище в обрядах и представлениях восточных славян / А. К. Байбурин. — Л. : Наука, 1983. — 188 с.
2. *Берман,* Иоанн. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Виленской губернии Ошмянского уезда / И. Берман. — СПб. : Тип. Майкова, 1874. — 44 с.
3. *Валенцова*, М. М. Первый — последний / М. М. Валенцова, И. А. Седакова // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. — Т. 3 : К (Круг) — П (Перепелка). — М. : Междунар. отношения, 2004. — С. 674—678.
4. *Вяселле*. Песні ў шасці кнігах / скл. Л. А. Малаш ; муз. дадат. З. Я. Мажэйка ; рэд. М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік (Бел. нар. творчасць). — Кн. 3. — Мінск : Навука і тэхніка, 1983. — 768 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Дай Божа знаць*, з кім век векаваць : Беларуская народная варажба / скл. У. А. Васілевіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 63 с.
6. *Жыцця* адвечны лад : беларускія народныя прыкметы і павер'і / укл., прадм. і пер. У. Васілевіч. — Кн. 2. — Мінск : Маст. літ., 1998. — 607 с.
7. *Зямля* стаіць пасярод свету : беларускія народныя прыкметы і павер'і / укл., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. — Кн. 1. — Мінск : Маст. літ., 1996. — 591 с.
8. *Катовіч*, *А. В*. Веснавыя святы : у 2 кн. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. — Кн. 1. — Мінск : Маст. літ., 2005. — 359 с.
9. *Крачковский, У. Ф*. Быт западно-русского селянина / Юл. Ф. Крачковский ; Изд.-во Имп. о-ва истории и истории древностей рос. при Моск. ун-те. — М. : Университетская тип., 1874. — 212 с.
10. *Крук*, *Я.* Колесо времени : традиции и современность / Я. Крук, О. Котович. — 3-е изд., испр. и доп. — Минск : Беларусь, 2010. — 350 с.
11. *Кухаронак*, *Т. І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў : канец XIX—XX ст. / Т. І. Кухаронак. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 126 с.
12. *Мухлинский, А.* Праздники, забавы, предрассудки и суеверные обряды простого народа в Новогрудском повете Литовско-Гродненской губернии // Вестник Европы. — 1830. — № 14.
13. *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды, легендарные сказания о лицах и местах Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровский. — Витебск : Губерн. Типо-Литограф., 1897. — 307 с.
14. *Романов, Е. Г.* Белорусский сборник : в 9 вып. 1885—1912 / Е. Г. Романов. — Вып. 8—9 : Быт белоруса. — Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. — 600 с.
15. *Радзіны :* Абрад. Песні / укл. і сістэм. тэкстаў Г. А. Пятроўскай, апісанне абрадаў Т. І. Кухаронак, уступ. арт. і камент. Г. А. Пятроўскай, Г. В. Таўлай, Т. І. Кухаронак ; рэдкал. : А. С. Фядосік [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 1998. — 637 с.
16. *Седакова, И. А.* Пелёнки / И. А. Седакова // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. — М. : Междунар. отношения, 2004. — 704 с. — Т. 3 : К (Круг) — П (Перепелка). — С. 658—660.
17. *Седакова, И. А.* Купание младенца / И. А. Седакова // Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. — М. : Междунар. отношения, 2004. — 704 с. — Т. 3 : К (Круг) — П (Перепелка). — С. 51—54.
18. *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. — Мінск : Універсітэцкае, 1998. — 301 с.
19. *Славянские* древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. — Т. 3 : К (Круг) — П (Перепелка). — М. : Междунар. отношения, 2004. — 704 с.
20. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2001—2010. — Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе, 2001. — 797 с.
*21. Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. — Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн. — Кн. 2. — Мінск : Выш. шк., 2006. — 736 с.
*22. Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : Сборник Отделения рус. языка и словесности Имп. Акад. наук : в 3 т., 1887—1902 / П. В. Шейн. — Т. I. — Ч. 1 : Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. — СПб. : Тип. Имп. акад. наук, 1887. — 585 с.

## АА

1. Астаповіч Васіль Андрэевіч, 1950 г. н., в. Данілевічі Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці.
2. Блінова Феня Антонаўна, 1928 г. н., в. Азярышча Мінскага раёна Мінскай вобласці; нарадзілася ў Брагінскім раёне Гомельскай вобласці.
3. Крук Еўдакія Іванаўна, 1898 г. н., в. Згурск Чэрвенскага раёна Мінскай вобласці.
4. Качэрская Галіна Іванаўна, 1931 г. н., в. Згурск Чэрвенскага раёна Мінскай вобласці, нарадзілася ў в. Пнявічы Чэрвенскага раёна.
5. Салановіч Марыя Іванаўна, 1939 г. н., в. Любонічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці.
6. Прыбалавец Тамара Іванаўна, 1956 г. н., в. Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

## Summary

*The article discusses the numerous ritual, oral poetic contexts of use of the fundamental category of «first» in the mythopoetic world model of the Belarusians. We claim that by using this quantitative indicator our ancestors separated the sphere of the sacred, celestial, and associated with time of the first creation, from the profane, everyday, repeating in the life of society.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ